5. Europa Nasza Historia // Europa Nasza Historia. – 2023. – URL: https://europa-nasza-historia.org/ (date of access: 01.02.2025).
6. *Trzcielińska-Polus, A.* Trzydzieści lat stosunków polsko-niemieckich w cieniu historii (1990–2020) / A. Trzcielińska-Polus // Krakowskie Studia Międzynarodowe. – 2020. – № 2. – P. 113–127.
7. *Wieliński, B. T.* Niemcy chcą postawić pomnik Polakom zamordowanym podczas drugiej wojny światowej // B. T. Wieliński // Gazeta Wyborcza. – 2020. – URL: http://wyborcza.pl/7,75399,22612024,niemcy-chca-postawic-pomnik-polakom-zamordowanym-podczas-drugiej.html (date of access: 01.02.2025).
8. *Ruchniewicz, K.* Yet Another Memorial in Berlin? // K. Ruchniewicz // Gazeta Wyborcza. – 2018. – URL: https://public-history-weekly.degruyter.com/6-2018-20/polish-victims-memorial-in-berlin/ (date of access: 01.02.2025).
9. Reparacje od Niemiec. Rząd przyjął uchwałę // Gazeta Prawna. – 2022. – URL: https://www.gazetaprawna.pl/wiadomosci/kraj/artykuly/8701231,reparacje-od-niemiec-rzad-przyjal-uchwale.html (date of access: 01.02.2025).
10. Raport o stratach poniesionych przez Polskę w wyniku agresji i okupacji niemieckiej w czasie II wojny światowej 1939–1945 // Instytut strat wojennych. – 2022. – URL: https://instytutstratwojennych.pl/strona/186-raport-pl-broszura-skrocony (date of access: 01.02.2025).

**(Дата падачы: 26.02.2025 г.)**

*А. К. Шымак*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*A. Shymak*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(47)**

## ПАПА АЛЯКСАНДР VI БОРДЖЫА І ЎСХОДНЯЯ ЕЎРОПА

## POPE ALEXANDER VI BORGIA AND EASTERN EUROPE

*У артыкуле разглядаецца пантыфікат папы Аляксандра VI (1492–1503 гг.) і асаблівасці яго палітыкі ва Усходняй Еўропе. Аб’ектам даследавання сталі міждзяржаўныя адносіны, якія разгарнуліся на фоне вайны Лівоніі і Пскова ў 1480–1481 гг., а таксама на фоне войнаў 1492–1494 гг, 1500–1503 гг. Маскоўскай дзяржавы і Вялікага Княства Літоўскага.*
*Ключавыя словы: апостальская Сталіца; Рымская курыя; Вялікае Княства Літоўскае; Маскоўскае княства; пасольства; легат; брэвэ.*

*The article examines the pontificate of Pope Alexander VI (1492–1503) and the features of his policy in Eastern Europe. The object of the study was interstate relations that developed against the background of the Livonian-Pskov War in 1480–1481, as well as against the background of the wars of 1492–1494 and 1500–1503 between the Moscow State and the Grand Duchy of Lithuania.*

*Keywords: Apostolic Capital; Roman Curia; Grand Duchy of Lithuania; Moscow Principality; embassy; legate; breve.*

Імя папы Аляксандра VI Борджыа атаясамліваецца, у першую чаргу, з часам заняпаду папства, стратай яго аўтарытэту, надмерным захапленнем багаццем і разгульным вобразам жыцця. Кажуць, што святыя найбольш пацярпелі ад аўтараў сваіх жыццеапісанняў. Канешне, гэтага пантыфіка святым ні ў якім разе назваць нельга, але не кожная публічная асоба здольная пахваліцца такой колькасцю міфаў і стэрэатыпаў пра свой жыццёвы шлях.

Радрыга Борджыа паходзіў са знакамітага роду, прадстаўнікі якога былі і кардыналамі, і рымскімі папамі. Нарадзіўся ў 1431 г. у Іспаніі, скончыў юрыдычны факультэт Балонскага ўніверсітэта і першымі крокамі будучай бліскучай духоўнай кар'еры быў абавязаны свайму дзядзьку – папе рымскаму Каліксту III. У 1456 г. Радрыга Борджыа стаў кардыналам, а ў 1457 г. – віцэ-канслерам Рымскай курыі. Функцыі кардыналаў у тую эпоху былі звязаныя пераважна з адміністратыўнымі і палітычнымі справамі. Яны датычыліся больш касцёльнага права, чым душпастырскай службы. Таму сярод кардыналаў было шмат свецкіх. Іспанцу Радрыга Борджыа было наканавана займацца вайсковай ці юрыдычнай справай, да духоўнага стану яго ніхто не рыхтаваў.

Асноўныя скандальныя факты біяграфіі папы Борджыа звязаныя з магчымым атручваннем апанентаў, наяўнасцю дзяцей і іх лабіраваннем. Дакладнага пацвярджэння абвінавачванняў у забойствах да сённяшняга часу ніхто не прадставіў. Асноўнай крыніцай інфармацыі пра штодзеннасць гэтага пантыфіка стаў дзённік Ёгана Бурхарда, які выконваў абавязкі цэрэманімайстра пры папскім двары [1]. Бурхард быў немцам па паходжанні, меў непрыязнасць да італьянцаў і іспанцаў, таму яго погляд даследчыкі лічаць вельмі прадузятым [2]. Калі чытаць і цалкам давяраць гэтаму аўтару, то атрымаецца, што папа быў такім амаль вар'ятам, які, нягледзячы на акаляючы яго свет, тварыў і дзівацтвы, і страшныя рэчы.

Калі пакінуць па-за ўвагай скандальную частку яго жыцця і паглядзець на Аляксандра VI як на палітыка, то можна заўважыць, што ён быў таленавітым адміністратарам, сёння б яго назвалі выдатным мэнаджарам. Гэтыя якасці паўплывалі і на выбар, які быў зроблены на канклаве 1492 г. У Радрыга Борджыа быў вопыт працы ў Рымскай курыі пры папярэдніх пантыфіках, яго ведалі, з ім лічыліся, і ён меў уплыў.

Аляксандр VI быў дастаткова памяркоўным у адносінах да сваіх падданых, зменшыў падаткі, падтрымаў габрэяў, якія пасля іспанскага закону 1492 г. павінны былі пакінуць краіну, калі не прымуць хрост. Ён дазволіў ім знаходзіцца ў Папскай дзяржаве і ўзяў іх пад сваю апеку. Папа не жадаў распачацця судовага працэсу ў адносінах да насельніцтва Дафінэ, Савоі і П'емонту, якіх абвінавачвалі ў падтрымцы вальдэнскай ерасі.

На пантыфікат папы Аляксандра VI прыпадае першы перыяд Італьянскіх войнаў – барацьба за Неапалітанскае каралеўства. Французскі кароль Карл VIII быў супраць абрання Радрыга Борджыа папам рымскім. Яго непрыязнасць узрасла таксама з-за таго, што папа ў 1494 г. падтрымаў неапалітанскага караля Альфонса II з арагонскай дынастыі. Ваенны паход французкай арміі скончыўся перамогай над аб'яднанымі папскімі, неапалітанскімі і фларэнтыйскімі войскамі. Карл VIII здолеў захапіць Неапаль, а таксама каранавацца візантыйскім імператарам, выкупіўшы тытул у апошняга з братоў Палеалогаў. Але ў 1495 г. быў разбіты і вярнуўся ў Францыю. Ад новага паходу папу выратавала толькі нечаканая смерць Карла VIII у 1498 г. [3].

Аляксандр VI жадаў умацаваць Касцёльную дзяржаву. Была створана рэгулярная армія, развіваўся адміністрацыйны апарат. Папа выступаў як сапраўдны манарх таго часу, калі вялікая ўвага надзялялася дыпламатыі. Пасля падарожжа Х. Калумба булламі 1493–1494 гг. папа рымскі падзяліў Новы Свет паміж Іспаніяй і Партугаліяй.

Пантыфік звяртаў увагу і на неабходнасць унутраных рэформаў у Касцёле. І галоўную мэту бачыў у тым, каб выключыць з жыцця кардыналаў раскошу, выкараніць сіманію[1] і ўвесці штрафы за канкубінат[2] духавенства. У 1500 г. быў абвешчаны Юбілейны год, у Рым накіраваліся шматлікія пілігрымы. Можна сустрэць меркаванне, што гэта было зроблена дзеля прытоку матэрыяльных рэсурсаў. Але трэба падкрэсліць, што абвяшчэнне Юбілейнага году ў гісторыі Касцёла заўсёды суправаджалася ўздымам рэлігійнасці, адновай духоўнага жыцця вернікаў.

Такім чынам, перад намі папа манарх, палітык, дыпламат, мецэнат і апякун мастацтва. Чалавек, які любіў і карыстаўся напоўню выгодамі жыцця, забываючыся аб сваім духоўным стане. Але зараз звернем увагу на іншы аспект пантыфікату папы Борджыа – знешнюю палітыку ў адносінах да Усходняй Еўропы.

Пасля падзення Канстантынопаля і захопу балканскага рэгіёну Асманскай імперыяй ўсходнехрысціянскі свет згубіў адчуванне адзінства. Маскоўскае княства ў часы Івана III зрабіла першую спробу заявіць аб сабе, як аб спадкаемцы Візантыі. Апостальская Сталіца станоўча ставілася да таго, каб шлюб маскоўскага князя і пляменніцы візантыйскга імператара ўспрымаўся ў такім ракурсе. У перыяд з 1492 па 1503 г. папская дыпламатыя судакраналася з усходнееўрапейскім рэгіёнам у двух вузлавых пытаннях: вайна Лівонскага ордэна і Масквы, прэтэнзіі Івана III на «землі Русі» і яго канфрантацыя з Вялікім Княствам Літоўскім.

Перманентныя памежныя канфлікты Лівонскага ордэна і Пскова выбухнулі ў 1480 г. вайной. Яна завяршылася праз год 10-гадовым пера-

[1] Сіманія – продаж і купля касцёльных пасадаў.

[2] Канкубінат – трывалая сувязь паміж мужчынам і жанчынай, непацверджаная заключэннем сужэнскага саюзу.

мір’ем. Але было відавочным, што канфлікт замарожаны толькі на час. Лівонскі магістр Бернгард фон дэр Борх, а пазней Вальтэр фон Плеттэнберг спадзяваліся кансалідаваць арцыбіскупства, Рыгу і ганзейскія гарады і пры падтрымцы Рыма застрахавацца сябе ад небяспекі з усходу. Распачаліся мерапрыемствы па стварэнні антымаскоўскай кааліцыі, не апошнім удзельнікам каторай павінен быў стаць і папа рымскі [4, № 405, 411]. З гэтай мэтай у Рым рэгулярна накіроўваліся лісты, якія павінны былі запэўніць папу, што «Масковія» з’яўляецца пагрозай не толькі для Лівоніі, але і для ўсяго каталіцкага Захаду.

Але нягледзячы на шматлікія заклікі з боку і Лівоніі, і Тэўтонскага ордэна, папа рымскі не рабіў рэзкіх крокаў, каб змяніць расклад сіл ва Усходняй Еўропе. У 1495 г. Іван III распачаў вайну са Швецыяй, жадаючы захапіць Заходнюю Карэлію. У першай палове 1496 г. быў здзейснены ваенны паход углыб Фінляндыі. І толькі пасля таго, як войскі Івана III пачалі атрымліваць перавагу, летам 1496 г. у Рыме была абвешчана була, якая дазваляла прапаведаваць крыжовы паход супраць «рускіх» у Швецыі і Лівоніі [4, № 56]. Гэтае рашэнне Рымскай курыі было больш гучным, чым здольным прынесці адчувальную дапамогу. Папа рымскі падрыхтаваў брэвэ да Івана III, у якім пераконваў вялікага князя маскоўскага не нападаць на Лівонію. Папа Аляксандр VI звярнуўся таксама да дацкага караля, вялікага князя літоўскага, да ганзейскіх гарадоў, просячы аказаць дапамогу Лівоніі і не ўступаць у саюзныя адносіны з Іванам III [4, № 747, 752].

Ордэн жа чакаў зусім іншых дзеянняў. Па-першае, абвяшчэння крыжовага паходу ў шэрагу еўрапейскіх краін, а не толькі ў Швецыі і Лівоніі. Па-другое, дазволу на продаж індульгенцый, каб атрыманыя грошы выкарыстаць у вайне з Масквой. Без згоды Курыі Ордэн не мог адмовіцца ад удзелу ў агульнахрысціянскай справе – антыасманскім паходзе [4, № 1077; 5, № 918].

Абвешчаны ў 1500 г. Юбілейны год павінен быў стаць не толькі годам навяртання вернікаў Касцёла, але і спрыяць міру і супакою ў свеце. У кастрычніку 1500 г. папа Аляксандр VI накіраваў свайго легата да Ягелонаў, каб заключыць перамір’і там, дзе ідуць войны, і пачаць сумесную барацьбу з асманамі [195, s. 35–36; 274, s. 32]. Перашкодай на гэтым шляху сталі адносіны Маскоўскага княства і Вялікага княства Літоўскага. З канца 80-х гг. XV ст. паміж імі трывала памежная вайна, якая абвастрылася ў 1492 г. Ішла актыўная падрыхтоўка да ваенных дзеянняў. Маскоўскія пасольствы накіроўваліся ў Крым, а таксама да Конрада Мазавецкага і магістра Тэўтонскага ордэна, каб арганізаваць антыягелонскі саюз [6, s. 123–150]. У 1494 г. была падпісана дамова паміж Іванам III і Аляксандрам Ягелончыкам. Яна ўмацоўвалася шлюбам Аляксандра і Алены Іванаўны. Але ўсім было зразумела, што вайна прыпынілася часова. Абодва бакі мелі намер аднавіць ваенныя дзеянні. Новы канфлікт разгарэўся ў 1500 г.

У сакавіку 1501 г. Лівонскі ордэн таксама ўступіў у вайну і некалькі разоў паўтарыў просьбы арганізаваць крыжовы паход супраць «маскавітаў» [243, № 214–216, 290–292]. У студзені 1501 г. Аляксандр Ягелончык накіраваў у Рым свайго сакратара Эразма Цёлка, які паведаміў пра небяспеку, якая навісла над княствам з боку «няверных» і заклікаў еўрапейскія дзяржавы да барацьбы [7, s. 22–50]. Яшчэ крыху раней, у 1500 г., у лісце польскага караля Яна Альбрэхта да папы Аляксандра VI з'явілася вызначэнне Польшчы як «бастыёна» (antemuralia) заходняга свету ў барацьбе з «няверныміі. Гэтая ж палітыка знайшла сваё адлюстраванне і ў дыпламатыі Аляксандра Ягелончыка. У 1502 г. ужо не толькі Карона Польская, але і Вялікае княства Літоўскае стала называць сябе «antemuralia». Узяты тытул павінен быў аказаць садзейнічанне не толькі ўмацаванню цесных узаемаадносін з Апостальскім Прастолам, але і дапамагчы вырашыць літоўска-маскоўскія супярэчнасці [8, s. 33–34].

У адказ на шматлікія заклікі папа Аляксандр VI накіраваў у Маскву спецыяльную грамату, дзе заклікаў Івана III, па прыкладзе польскага караля, змагацца з Асманскай імперыяй [9, № 192]. Але на абвяшчэнне крыжовага паходу Рым так і не пайшоў. Магчыма, што на пазіцыю Курыі паўплывала пасольства Дзмітрыя Ралева і Мануіла Карачарава. Маскоўскія паслы маглі распаўсюдзіць звесткі аб тым, што Іван III зацікаўлены ў царкоўнай уніі і жадае весці антыасманскую вайну. У падзеях пачатку XVI ст. ва Усходняй Еўропе можна ўбачыць, як рэлігійнае пытанне станавілася падобным на кубік настольнай гульні. Іван III распачаў гэту гульню з Рымам і паварочваў кубік то праваслаўным, то каталіцкім бокам – як яму было больш выгодна.

У хуткім часе ў Маскву прыбыў венгерскі пасол Жыгімонт Сантай. Ён прывёз таксама граматы ад папы і кардынала Ісвальеза з дыяцэзіі Рэджыа (у рускіх летапісах – кардынал Рэгнус). Гэты кардынал быў прызначаны надзвычайным паслом (a latere) да Ягелонаў і ў Маскоўскае княства [6, s. 147] «Того же лета приходил к великому князю Ивану Васильевичу от угорского короля от Владислава посол Сигизмунт Сантай. А правил благословение и поздравление от папы Римского да от Регнуса кардинала» [10, с. 84]. Папа Аляксандр VI выражаў жаданне весці барацьбу за вызваленне ўсяго «Канстанцінопальскага царства» і для гэтага прапанаваў Івану III далучыцца да венгерскага, польскага, чэшскага каралеўстваў, да Вялікага Княства Літоўскага, Прускіх княстваў, Лівонскага ордэна. Пантыфік звярнуў увагу, што вайна паміж Іванам III і Аляксандрам Казіміравічам перашкаджае стварэнню такога саюза. Але Іван III адказаў, што каралі Уладзіслаў і Аляксандр змагаюцца не за свае землі, а за тэрыторыю, якой здаўна валодалі яго продкі [11, с. 341–361]. Даследчык адносін Масквы і Рымскай курыі Я. Ф. Шмурла ўдала заўважыў, што, трэба думаць, не без ганарлівага пачуцця задавальнення выслухоўваў маскоўскі князь усе гэтыя прамовы [12, с. 95].

Іван III меў «добрае апраўданне», каб адмовіць у перамір'і, – яго дачку прымушаюць здрадзіць сваёй веры. Справа была ў тым, што папа Аляксандр VI быў уцягнуты ў вырашэнне яшчэ адной праблемы, якая ўзнікла ва Усходняй Еўропе – праблемы з веравызнаннем жонкі Аляксандра Ягелончыка. Актыўным удзельнікам перамоваў з Рымскай курыяй выступіў родны брат Аляксандра польскі прымас, гнезненскі арцыбіскуп і кардынал кракаўскі Фрэдэрык. Папа Аляксандр VI звяртаўся да віленскага біскупа Войцэха, вызваляючы Аляксандра ад дадзеных Івану III абавязацельстваў не прымушаць Алену пераходзіць у каталіцтва. Адначасова біскуп павінен быў весці размовы з Аленай, а калі яна не падпарадкуецца, то адлучыць яе ад мужа, выгнаць з дому і маёмасць канфіскаваць (але ануляваць шлюб не дазваляў). Пантыфік пісаў, што Аляксандр можа пакінуць сваю жонку, заражаную «Ruthenorum maculis» (рускім брудам) [13, s. 85]. Папа сказаў абвясціць Алене, што ў выпадку нязгоды да яе будуць ставіцца паводле нормаў касцёльнага права, і яна будзе пакараная [14, s. 303, 310–312]. Пазіцыя Курыі змянілася, калі пачаўся пантыфікат папы Юлія II (1503–1513). Папа дазволіў Аляксандру не адлучаць ад сябе Алену, але пры ўмове, што пасля смерці Івана III зноў неабходна настойваць на яе пераходзе ў каталіцтва.

Прадстаўнікі Вялікага Княства Літоўскага пераконвалі Івана III, што «Святый папа не того хочет, чтобы она свой греческий закон оставила, а к римскому закону приступила; хочет, господине, того, чтобы она ему послушенство сотворила, в соединение была подле осмаго Фролентийского Собора» [11, с. 407]. Івану III было прапанавана паслаць свайго прадстаўніка да папы ці даручыць весці гэтую справу таму, хто паедзе ў Рым ад імя вялікага князя літоўскага. Вялікі князь маскоўскі адмовіўся: «[…] и Папа бы положил то на свой разум, гораздо ли то короли чинят, что не за свою отчину с нами хотят воячити»). Іван III запэўніваў папу ў сваёй адданасці «христианскому делу»: «[…] Ино мы с Божьею волею, как наперед тог за христианство стояли, так и ныне стоим, и впредь аж даст Бог, уповая на Бога, хотим за христианство противу поганства стояти, как нам Бог поможет, и просим у Бога того, чтобы дал Бог, христианская рука высока была над поганством» [10, с. 85–86].

Пасля доўгіх перамоваў вялікі князь маскоўскі пагадзіўся на шасцігадовае перамір'е. У красавіку 1503 г. адбылося крыжацалаванне на перамірных граматах паміж Вялікім княствам Маскоўскім і Вялікім княствам Літоўскім. У ліпені 1503 г. у Ноўгарадзе была зацверджана дамова з Лівонскім ордэнам.

18 жніўня 1503 г. памёр папа Аляксандр VI. Падчас яго пантыфікату адбываліся значныя змены ва Усходняй Еўропе. Маскоўскі князь Іван III распачаў барацьбу за «землі Русі», памежныя канфлікты перарасталі ў сапраўдныя войны. Лівонскі ордэн, Вялікае Княства Літоўскае, Маскоўскае княства імкнуліся дасягнуць сваіх мэтаў, спадзеючыся на падтрым-

ку Апостальскай Сталіцы. Папа Аляксандр VI, нягледзячы на яго бурную біяграфію, прытрымліваўся стрыманай палітыкі. Падтрымліваў, у першую чаргу, каталіцкія дзяржавы, але з ахвотай згаджаўся і на «заляцанні» Івана III. Праблемы Усходняй Еўропы хоць і не былі на першым месцы папскай дыпламатыі, у параўнанні з пытаннем антыасманскай кааліцыі, але ніколі не заставаліся па-за ўвагай Рымскай курыі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Burchard, J.* Diarium / J. Burchard. – Paris: Librare de la Societe Asiatique, 1885. – T. III: 1500–1506. – 578 p.

2. Zródła historyczne do życiorysu Papieża Alexandra VI // Przegląd Katolicki. – 1872.12.19 – R.10 nr 51. – URL: https://www.wbc.poznan.pl/dlibra/publication/286598/edition/253403/content (дата обращения: 25.02.2025).

3. *Banaszak, M.* Historia Kościoła katolickiego / M. Banaszak. – URL: https://www.kosciolgarnizonowy.pl/histora_kosciola_katolickiego.pdf (дата обращения: 20.02.2025).

4. Liv-, Est- und Curländisches Urkundenbuch / Begründet von F. G. v. Bunge, im Auftrage der baltischen Rittenschaften und Städte fortgesetzt von Hermann Hildebrand, Phillipp Schwartz und Leonid Arbusow; herausgegeben von Arbusow. – Riga-Moskau: «Kommissions-Verlag von J. Deubner», 1900. – Zweite Abteilung, Band 1: 1494, Ende Mai – 1500. – 900 s.

5. Liv-, Est- und Curländisches Urkundenbuch / Begründet von F. G. v. Bunge, im Auftrage der baltischen Rittenschaften und Städte fortgesetzt von Hermann Hildebrand, Phillipp Schwartz und Leonid Arbusow; herausgegeben von Arbusow. – Riga-Moskau: «Kommissions-Verlag von J. Deubner», 1914. – Zweite Abteilung, Band 3: 1505–1510. – 827 s.

6. *Bojko, K.* Stosunki dyplomatyczne Moskwy z Europą Zachodnią w czasach Iwana III / K. Bojko. – Kraków: Księgarnia Akademicka, 2010. – 221 s.

7. *Folwarski, H.* Erazm Ciołek, Biskup i Dyplomata / H. Folwarski. – Varsoviae: Dom Książki Polskiej, 1935. – 220 s.

8. Chynczewska-Hennel T. Stolica Apostolska i Rzeczpospolita w czasach nowożytnych // Polska i Stolica Apostolska X–XXI wiek / red. D. Gales. – Warszawa: ARGRAF, 2006. – S. 32–42.

9. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссиею: в 5 т. – Санкт-Петербург: Тип. II Отдел. Собственной Е. И. В. Канцелярии, 1846. – Т. I: 1340–1506. – 419 с.

10. «Выписка из посольских книг» о сношениях Российского государства с Польско-Литовским за 1487–1572 гг. / сост. Б. Н. Морозов; под ред. С. О. Шмидта. – Москва-Варшава: Археографический центр, 1997. – 330 с.

11. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским государством // Сб. Императорского русского исторического общества. – 1882. – Т. 35. – 870 с.

12. *Шмурло, Е. Ф.* Рим и Москва. Начало сношений Московского государства с Папским престолом (1462–1528) / Е. Ф. Шмурло // Записки Русского исторического Общества в Праге. – Прага Чешская-Нарва, 1937. – Кн. 3. – С. 91–136.

13. Kopiarz Rzymski Erazma Ciołka / oprazowali Stanisław Kutrzeba i X. Jan Fijałek // Archiwum Komisji Historycznej. Serja 2. – Kraków: Akad. Umiejętnośći, 1923. – T. I. – S. 66–113.

14. Vetera monumenta Poloniae et Lithuaniae gentiumgue finitimarum historiam illustrantia maximam partem nondum edita ex tabulariis vaticanis deprompta, collecta ac serie chronologica deposita ab Augustino Theiner. – T. I. –IV. – Romae: Typis vaticanis, 1861. – T. II. – 782 s.

**(Дата падачы: 28.02.2025 г.)**